ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 2 2008
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

## ГІСТОРЫЯ

*УДК 9(476)-058.232.6*

*Н. В. ЗАЙЦАВА*

# КУЛЬТУРНА - БЫТАВОЕ АБСЛУГОЎВАННЕ СЯЛА Ў 1966–1975 ГАДАХ

*Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 26.06.2007)*

Рэпазіторый БНТУ

Да пачатку восьмай пяцігодкі ў Беларусі яшчэ не склалася стройная сістэма бытавога абслугоўвання. Большасць прадпрыемстваў уяўлялі сабою дробныя паўсаматужныя майстэрні з нізкім узроўнем механізавання працы, якія былі раз'яднаныя па шматлікіх міністэрствах, а ў сельскай мясцовасці абслугоўваннем насельніцтва займалася ў асноўным спажывецкая кааперацыя. Для ўсебаковага даследавання сацыяльна-бытавых умоў беларускага сялянства перыяду 1966–1975гг. пытанні развіцця і ўдасканалення сістэмы культурна-бытавога абслугоўвання на сяле з'яўляліся аднымі з асноўных. Развіццё і ўдасканаленне сістэмы культурна-бытавога абслугоўвання працаўнікоў калгаснай вёскі з'яўляліся адным з фактараў замацавання кадраў і прыцягнення працоўнай сілы. Даследаванне і аналіз вышэйназванай праблемы і з'явіліся мэтай дадзенага артыкула.

У артыкуле скарыстаны матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, статыстычных зборнікаў і матэрыялы даследаванняў, якія праводзіліся раней.

У 1966–1975 гг. у бытавым абслугоўванні сельскага насельніцтва рэспублікі адбыліся істотныя пазітыўныя зрухі. Цэнтральнымі і мясцовымі органамі ўлады быў ажыццёўлены шэраг мер па аграмаджанні вытворчасці бытавых паслуг, засяроджванню ўсіх выглядаў бытавога абслугоўвання насельніцтва ў адным ведамстве. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 13 жніўня 1966 г. у рэспубліцы было створана Міністэрства бытавога абслугоўвання насельніцтва БССР (Мінбыт БССР). Паступова ў яго распараджэнне былі перададзены ўсе асноўныя прадпрыемствы і ўстановы, якія аказвалі насельніцтву бытавыя паслугі. Ужо на пачатак дзявятай пяцігодкі ў сістэме Мінбыта БССР было засяроджана да 81,8% ад усяго аб'ёму бытавых паслуг, якія аказваліся насельніцтву рэспублікі, у тым ліку сельскаму – 93 % [1, с. 227].

Адначасова ва ўсіх раёнах рэспублікі былі створаны райбыткамбінаты. З'яўляючыся шматгаліновымі прадпрыемствамі, яны сталі галоўнымі арганізатарамі бытавога абслугоўвання сельскага насельніцтва, у тым ліку і калгаснага сялянства. Непасрэдна на сяле дзейнічалі іх падраздзяленні – дробныя майстэрні, атэлье, дамы быту і прыёмныя пункты. Аднак аб'ём паслуг, які аказваўся гэтымі прадпрыемствамі сельскім жыхарам, быў малаважным, якасць паслуг і культура абслугоўвання часта не адпавядалі асноўным патрабаванням. Паляпшэнне бытавога абслугоўвання сельскага насельніцтва патрабавала пераводу службы быту на індустрыяльную аснову, заснавання ў галіне буйных спецыялізаваных прадпрыемстваў і аб'яднанняў, фірм і іх філіялаў, якія ў перспектыве павінны былі стаць асноўнымі гасразліковымі звёнамі ўсёй грамадскай вытворчасці

Для службы быту гэта мела асабліва важнае значэнне, бо перавага ў галіне дробных і сярэдніх прадпрыемстваў не дазваляла ў поўнай меры выкарыстаць найноўшыя дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэсу і не магла забяспечыць паспяховае рашэнне задач па пераводзе бытавога абслугоўвання сельскага насельніцтва на індустрыяльную аснову.

Працэс канцэнтрацыі і спецыялізацыі вытворчасці бытавых паслуг у рэспубліцы прыкметна ўзмацніўся з пераходам народнай гаспадаркі краіны на двух-трохзвенавую сістэму кіравання ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў БССР ад 2 сакавіка 1973 г. «Аб некаторых мерапрыемствах па далейшым удасканаленні кіравання прамысловасцю».

Асабліва хуткімі тэмпамі ён праходзіў у 1974–1975 гг. Толькі ў 1974 г. было створана 27 новых вытворчых і прамысловых аб'яднанняў ( з 48, арганізаваных у службе быту рэспублікі за 4 гады дзевятай пяцігодкі ). А ўсяго ў 1975 г. у сістэме Мінбыта БССР функцыянавала 80 буйных спецыялізаваных прадпрыемстваў і аб'яднанняў, што складала 24,6% ад усіх прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання насельніцтва рэспублікі. Было завершана стварэнне спецыялізаваных прадпрыемстваў і аб'яднанняў па асноўных відах паслуг ва ўсіх абласных цэнтрах. У выніку да канца дзевятай пяцігодкі на долю ўсіх аб'яднанняў і спецыялізаваных прадпрыемстваў у сістэме службы быту прыходзілася каля 70% усяго аб'ёму бытавых паслуг, якія аказваліся насельніцтву рэспублікі [2, с. 100].

У гарадах ужо былі пабудаваны камбінаты, якія аказвалі насельніцтву вялікі асартымент паслуг. Узводзіць такія прадпрыемствы ў кожнай вёсцы было немэтазгодна. Досыць было там мець комплексныя прыёмныя пункты, а ў калгасах і саўгасах, у якіх не было прадпрыемстваў службы быту, часова вырашыць пытанне стварэння комплексных прыёмных пунктаў (далей – КПП) за кошт вылучэння гаспадаркамі памяшканняў з 2–3 пакояў плошчай 50–70 кв. м. Планавалася паўсюдна ўкараніць каапераваныя сувязі раённых камбінатаў бытавога абслугоўвання са спецыялізаванымі прадпрыемствамі ў абласных цэнтрах і гарадах абласнога падначалення. Выкананне заяў адбывалася на буйных спецыялізаваных прадпрыемствах бытавога абслугоўвання, размешчаных у раённых цэнтрах або цэнтрах сельскага рассялення. Прадугледжвалася таксама арганізаваць навучанне касіраў-прыёмшчыкаў для сельскіх КПП, перагледзець парадак аплаты іх працы, зацікавіўшы гэтую катэгорыю працаўнікоў у павышэнні культуры і якасці абслугоўвання сельскага насельніцтва.

Аднак нават комплексных прыёмных пунктаў у сельскай мясцовасці не хапала. Яны часам размяшчаліся ў індывідуальных жылых хатах, дзе цяжка было забяспечыць абслугоўванне на належным узроўні. У асобныя гады адбывалася скарачэнне комплексных прыёмных пунктаў у сельскай мясцовасці з-за адмовы ўладальнікаў хат падоўжыць тэрмін арэнды. Калгаснікі марнавалі нямала часу на паездкі ў горад для афармлення дагавораў на шэраг бытавых паслуг. У сельскай мясцовасці на аднаго чалавека выраблялася ў 1,8 раза менш бытавых паслуг, чым у гарадах [2, с. 102].

Нягледзячы на тое што сельскія жыхары складалі больш 40% насельніцтва БССР, удзельная вага аказваемых ім бытавых паслуг была роўная ўсяго 30% ад агульнага аб'ёму дадзенай велічыні па рэспубліцы [2, с. 103].

Варта адзначыць, што ў вывучаемы перыяд дынаміка развіцця культурна-асветных і бытавых устаноў мела вельмі супярэчлівы характар. Калі за гады восьмай пяцігодкі ў 5 разоў павялічылася колькасць стадыёнаў і спартыўных пляцовак, у 1,5 раза – крам і палатак і ў 3,3 раза – майстэрняў па рамонце і пашыву абутку, то за гады дзевятай пяцігодкі ізноў скарацілася іх колькасць, адпаведна ў 2; 1,5 і 1,6 раза. Пры гэтым памяншэнне колькасці бібліятэк, дзіцячых садоў, ясляў і пляцовак сезоннага характару, а таксама клубаў мела месца як у восьмай, так і ў дзевятай пяцігодках. Разам з гэтым за 10 гадоў амаль у 15 разоў стала больш у гаспадарках дзіцячых садоў, ясляў і пляцовак сталага наведвання, у 10,7 раза – майстэрняў па рамонце і пашыву вопраткі, амаль у 5 разоў – сталовых, буфетаў і чайных, больш чым у 1,5 раза – лазняў і ў 4,3 раза – памяшканняў, якія належалі калгасам. Для адпачынку дзяцей калгаснікаў сярэдняга школьнага ўзросту пад час летніх канікулаў у дзевятай пяцігодцы было здадзена ў эксплуатацыю 15 піянерскіх лагераў на 15706 месцаў [2, с. 105].

Істотнае скарачэнне за гады восьмай і, асабліва, дзевятай пяцігодкі асобных аб'ектаў сацыяльна-бытавога і культурнага прызначэння ў калгасах рэспублікі мела сваю заканамерную для дадзенага этапу развіцця калгаснай вёскі абумоўленасць. Так, скарачэнне колькасці стадыёнаў і спартыўных пляцовак было абумоўлена не столькі скарачэннем колькасці моладзі на сяле, колькі павелічэннем добра абсталяваных стадыёнаў і спартыўных пляцовак пры агульнаадукацыйных школах і дамах

культуры, доступ куды быў адкрыты кожнаму жадаючаму. Дзіцячых садоў, ясляў і пляцовак сезоннага характару – адпаведным павелічэннем іх колькасці сталага наведвання; майстэрняў па рамонце і пашыву абутку – іх нерэнтабельнасцю з прычыны досыць поўнага задавальнення попыту сельскага насельніцтва неабходным асартыментам абутку гандлёвай сеткай і наяўнай яшчэ на сяле традыцыяй яе рамонту ў хатніх умовах; крам і палатак – якая азначылася ў апошнія гады тэндэнцыяй універсалізацыі гандлёвых кропак і, адпаведна, цэнтралізацыяй іх у буйнейшых сельскіх населеных пунктах, а таксама павелічэннем колькасці перасоўных крам; клубаў – ліквідацыяй іх (хат-чытальняў) у дробных населеных пунктах і, адпаведна, будаўніцтвам сучасных дамоў культуры ў цэнтрах калгасаў. Такім чынам, скарачэнне, якое мела месца, колькасці асобных аб'ектаў культурна-бытавога прызначэння калгасаў, нягледзячы на яго супярэчлівы характар, у сваёй аб'ектыўнай аснове мела прагрэсіўную скіраванасць, абумоўленую самой сутнасцю развіцця калгаснай вёскі ў даследуемы перыяд. Менавіта на гэтай аснове мелі месца таксама і даволі высокія тэмпы росту усіх астатніх культурна-асветных і бытавых устаноў калгасаў рэспублікі. Толькі за гады дзевятай пяцігодкі развіцця народнай гаспадаркі агульны прырост плошчы грамадскіх жылых памяшканняў і працоўных месцаў дамоў быту склаў больш паловы, а пасадкавых месцаў у сталовых, буфетах і чайных і дзіцячых месцаў у дашкольных установах – каля 2/3 іх агульнай наяўнасці ў гаспадарках на канец 1975 г. [2, с. 100].

Аднак, нягледзячы на значнае павышэнне тэмпаў росту будаўніцтва ў калгаснай вёсцы аб'ектаў невытворчага прызначэння, узровень забяспечанасці імі калектыўных гаспадарак у цэлым заставаўся нізкім. У 1975 г. на кожны калгас прыходзілася толькі 1,3 лазні і 1,04 дома культуры або клуба, тады як дзіцячых садоў і ясляў сталага наведвання мелася прыкладна адна адзінка на 8 калгасаў, сталовых і буфетаў – адна ўстанова на 27–28 калгасаў, дамоў быту – адзін на 37–38 калгасаў, піянерскіх лагераў – адзін на 138 калгасаў, санаторыяў і хат адпачынку – адзін на 500 калгасаў. На кожную гаспадарку прыходзілася таксама каля 8 жылых памяшканяў агульнай плошчай прыкладна 500 кв. метраў, або 0,45 кв. метра на аднаго жыхара калгаснай вёскі [2, с. 110]. Недастатковы быў і аб'ём будаўніцтва дзіцячых дашкольных устаноў у вёсках. Забяспечанасць дзяцей дашкольнымі ўстановамі ў сельскай мясцовасці састаўляла 16% ад патрэбы [3, с. 76]. Тэмпы ўводу дзіцячых садоў і ясляў у эксплуатацыю заставаліся вельмі нізкімі, часта не выконваліся планы іх будаўніцтва. Аналагічная сітуацыя назіралася з адукацыйнымі і медыцынскімі ўстановамі.

Разам з нізкім узроўнем забяспечанасці калгасаў аб'ектамі культурна-бытавога прызначэння таксама мела месца іх нераўнамернае размяшчэнне не толькі па асобных гаспадарках, але і па раёнах, і нават па абласцях у цэлым. У такіх раёнах, як Слуцкі Мінскай вобласці, Талачынскі Віцебскай вобласці, Рэчыцкі Гомельскай вобласці і некаторых іншых, у якіх на канец 1975 г. наогул ні ў адной з калектыўных гаспадарак не было пабудавана ніводнай сталай дашкольнай дзіцячай установы. З 15 піянерскіх лагераў на 15706 месцаў 11 на 15216 месцаў былі арганізаваны калгасамі Мінскай вобласці, 3 на 330 месцаў – калгасамі Брэсцкай вобласці і 1 на 160 месцаў – калгасам Віцебскай вобласці, тады як у Гомельскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцях іх не было ніводнага [4, с. 81].

Трэба падкрэсліць, што спосаб жыцця, вытворчая актыўнасць працаўнікоў сельскай гаспадаркі, эфектыўнасць дадзенай галіны заўсёды залежалі ад узроўню развіцця ў сельскай мясцовасці сацыяльнай інфраструктуры, комплекснасці рашэння вытворча-эканамічных і культурна-бытавых праблем вёскі. Існуе цесная ўзаемасувязь невытворчай інфраструктуры і сацыяльна-эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці. Высокі ўзровень забяспечанасці калгаснікаў асноўнымі невытворчымі фондамі і жыллём, добраўпарадкаванне кватэр у адпаведнасці з наяўнымі патрабаваннямі працаўнікоў – гэта фактары, якія вызначалі вытворчыя поспехі шэрагу перадавых калгасаў. Уладкаванасць быту прыцягвала ў такія гаспадаркі моладзь, доля якой у агульнай колькасці працуючых калгаснікаў у такіх гаспадарках была даволі высокай.

У гэтым адзінстве сацыяльных і вытворчых фактараў асноўным з'яўляўся ўзровень эфектыўнасці вытворчасці. І эканамічна слабым калгасам трэба было першапачаткова павысіць эфектыўнасць вытворчасці, рост якой з'яўляўся надзейнай гарантыяй пераадолення негатыўных тэндэнцый у сацыяльнай сферы.

Разгортванне шырокага культурна-бытавога будаўніцтва на сяле патрабавала не толькі адпаведных капіталаўкладанняў, але і добра развітой будаўнічай індустрыі. Гэта была адна з най-

больш вострых праблем у выразна акрэсленай тэндэнцыі карэннага пераўтварэння сацыяльнага і культурнага аблічча калгаснай вёскі. Нават эканамічна моцныя калгасы, якія накіроўвалі на гэтыя мэты даволі значныя грашовыя сродкі, з прычыны недастатковасці будаўнічых магутнасцей не маглі выкарыстаць іх у поўнай меры.

Найбольш пасяховае рашэнне гэтай праблемы, відаць, магчыма было толькі на аснове больш інтэнсіўнага пашырэння ў цэнтралізаваным парадку як матэрыяльнай базы сельскай будаўнічай індустрыі, так і будаўніцтва падрадным спосабам спецыялізаванымі арганізацыямі, якімі з'яўляліся міжкалгасныя будаўнічыя арганізацыі (МБА)[5, с. 474]. У вартасным выражэнні аб'ём выкананых міжкалгаснымі будаўнічымі арганізацыямі гэтых прац у калгасах склаў 59,6 млн руб. За гады дзесятай пяцігодкі ён павінен быў павялічыцца амаль у 2 разы, дасягнуўшы сумы 100 млн руб.[1, с. 221].

Такім чынам, адставанне бытавых умоў сельскага насельніцтва было абумоўлена нераўнамернасцю развіцця сеткі ўстаноў культуры, бытавога і сацыяльнага абслугоўвання, а таксама недастатковасцю яе арыентацыі на задавальненне запатрабаванняў працаўнікоў вёскі. Разам з тым нельга не ўлічваць і таго, што шматлікія ўстановы культуры, бытавога і сацыяльнага абслугоўвання ў калгасах былі размешчаны ў старых будынках некапітальнага характару, што таксама рабіла негатыўны ўплыў на развіццё дадзенай інфраструктуры.

## Літаратура


1. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1970 году. Статистический сборник / Центр. стат. упр. при Совете Министров Белор. ССР. – Минск: Статистика. Белорусское отделение, 1971. – 416 с.

2.Народное хозяйство Белорусской ССР в 1975 году. Статистический ежегодник / Центр. стат. упр. при Совете Министров Белор. ССР. – Минск: Беларусь, 1976. – 268 с.

3. Национальный архив Республики Беларусь. – Фонд 4.– Оп.81. – Д. 2472. Материалы к протоколу № 61 от 18 мая 1973 г. Т.1. – 269 л.

4. Национальный архив Республики Беларусь. – Фонд 42. – Оп.7. – Д. 1253. Сводные статотчеты министерства и облоно о работе детских внешкольных учреждений, детско-юношеских спортивных школ и летних детских площадок за 1975 г. – 65 л.

5. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / Рэдкал.: І.М. Ігнаценка (старшыня) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – Т. 5: Беларуская ССР у перыяд стварэння развітога сацыялістычнага грамадства і будаўніцтва камунізму (1945–1974 гг.) / А.А.Філімонаў [і інш.]. – 776 с.



*N. V. ZAITSAVA*


**CULTURAL AND DOMESTIC SERVICE CONDITIONS IN THE VILLAGE IN 1966–1975**

## Summary


Farmer's life style, productive activity and the effectiveness of this branch of production had been depended on the social infrastructure level of development and the complexity of productive, economic and cultural village problems decision.

There is the close connection between non-productive infrastructure and social-economic effectiveness of production.

The high level of the well-being of collective farmers with their basic social and productive foundations and houses, the flats with all modern facilities is a main factor of the productive success of a row of collective farms. The good cultural and domestic service conditions attract the young people. The proportion of the young people in such collective farms was rather high.

The highest level of farming is the main factor in the concerned unity of the social and productive factors. Consequently the weak farms would rise the effectiveness of the production at first and then improve the social sphere.


Репозиторий БНТУ